ЯК БЕЛАРУСЫ ЖЫВУЦЬ У САМАІЗАЛЯЦЫІ 5

УСЁ, ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА КАРАНАВІРУС 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

22 КРАСАВІКА 2020 г. СЕРАДА

№ 78 (29192)

ЗВЯЗДА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ ПАВІННЫ ВЫКАНАЦЬ ПЛАНЫ, ЯКІЯ ПЕРАД НАМІ СТАЯЦЬ»

Перапрафілюючы прадпрыемствы пад надзённыя патрэбы, не трэба забывацца і пра асноўную прадукцыю, на якой яны спецыялізуюцца

Фота БелТА.

Пытанні сельскай гаспадаркі, стан айчыннай і сусветнай эканомікі, развіццё сістэмы аховы здароўя, выкананне даручэнняў па вытворчасці ахоўных сродкаў для медыкаў і насельніцтва былі на парадку чарговай рабочай камандзіроўкі Прэзідэнта па краіне. Учора Аляксандр Лукашэнка завітаў у Бабруйск, дзе пазнаёміўся з дзейнасцю ААТ «Славянка». Адзін з найбуйнейшых вытворцаў адзення з лютага пачаў шыць ахоўныя маскі. Сёння ўсе магутнасці прадпрыемства перапрафіляваны на іх вытворчасць, штодня выпускаюць каля 150 тысяч штук. Таксама «Славянка» асвоіла вытворчасць аднаразовага адзення для медыцынскага персаналу.

Прэзідэнт пазнаёміўся з працоўным калектывам прадпрыемства і даў адказы на пытанні супрацоўнікаў.

Медыкі — лечаць, улада — дапамагае

Прэзідэнту далажылі аб сацыяльна-эканамічным развіцці Магілёўскай вобласці, супрацьдзеянні распаўсюджванню каранавіруса. Але першае пытанне, адразу пасля прызямлення верталёта, было пра надзённае — пасяўную кампанію. Асаблівую ўвагу кіраўнік дзяржавы звярнуў на вырошчванне грэчкі, растлумачыўшы гэта тым, што па гэтай культуры няма дамоўленасці з расіянамі.

Таксама Аляксандр Лукашэнка спытаў, як ідзе сяўба іншых культур, ці ёсць у прадпрыемстваў пытанні з наяўнасцю паліва і ўгнаенняў. Трымаў адказ старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Заяц. «Своечасова ўсё пасеем», — запэўніў ён, адзначыўшы, што істотных праблем няма.

Ужо пасля прыбыцця на «Славянку» старшыня Магілёўскага аблвыканкама далажыў, што амаль усе галіны эканомікі вобласці спрацавалі дынамічна.

«Добра, але не думай, што з-за нейкага псіхозу мы павінны саступіць ці спрасціць патрабаванні да вас. ***Мы павінны выканаць тыя планы, якія перад намі стаяць»***, — падкрэсліў Прэзідэнт.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, на працягу месяца сусветная эканоміка, у тым ліку і ў найбліжэйшых суседзяў, пачне працаваць. «Еўропа пачала адчыняцца. ***На працягу месяца, я ўпэўнены, сусветная эканоміка, асабліва ў нашых суседзяў, будзе працаваць. У тым ліку і ў Расіі.*** Яны ўжо разумеюць, куды ўскочылі. Усе разумеюць у свеце», — перакананы лідар краіны.

Леанід Заяц працягнуў свой даклад, расказваючы пра поспехі вобласці ў будаўніцтве новых сацыяльных аб'ектаў. У Прэзідэнта яшчэ будзе магчымасць пазнаёміцца з імі бліжэй — ён паведаміў, што з цягам часу яшчэ завітае ў рэгіён.

Апошнімі месяцамі тэма эканомікі непарыўна звязана з захворваннямі, а калі дакладней, то з адным — каранавірусам. Таму наступнай тэмай для абмеркавання стала дзейнасць сістэмы аховы здароўя і яе патрэбы.

Прэзідэнт праінфармаваў, што міжнародныя банкі і фонды дапамогуць Беларусі сродкамі на медыцыну.

СТАР. 2

ЁСЦЬ СЦЕНЫ — БУДЗЕ І ДАХ

Фота БелТА.

60-кватэрны дом для шматдзетных сем'яў узводзіцца ў новым мікрараёне ў Жыткавічах. Завяршыць будаўніцтва плануецца ў чэрвені. Гэта ўжо трынаццаты дом новага мікрараёна № 10, забудову якога пачалі ў снежні 2014 года. На здымку: брыгадзір муляроў Генадзь МЕЛЯШЧЭНЯ.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:

«Мы сёння бачым і разумеем, што ў выніку эканамічнай сітуацыі, якая складваецца ў свеце з-за пандэміі, многія нашы прадпрыемствы апынуліся ў досыць няпростай сітуацыі. Парушаюцца вытворчыя ланцужкі, ёсць складанасці з рэалізацыяй на экспарт. У гэтых умовах асабліва няпроста тым прадпрыемствам, якія не маюць запасу трываласці. Прафсаюзы акажуць падтрымку работнікам прадпрыемстваў, якія трапілі ў складаную эканамічную сітуацыю».

Беларусь! Памяць і гонар. Абеліскі пакаленай зямлі. Адраджэнне

ЯК НЕ ПЕРАСТУПІЦЬ РЫСУ НЯНАВІСЦІ?

Аповед пра Халакост — гэта пасыл будучым пакаленням

Наступствы былой трагедыі адчуваюцца і сёння. На яўрэйскім вяселлі не рэдкасць, калі з боку аднаго з маладых у разы менш гасцей, бо сваякі былі знішчаны падчас Другой сусветнай вайны. Халакост невыпадкова стаў асобнай тэмай у гісторыі памяці пра вайну. Цяжка зразумець, як наогул магла зарадзіцца і ажыццяўляцца ідэя аб вынішчэнні цэлай нацыі. Таму для яўрэйскага народа вельмі важна, каб на помніках, якія нагадваюць пра жахлівыя падзеі 40-х гадоў мінулага стагоддзя, абавязкова была пазначана нацыянальнасць ахвяр.

Карта з помнікаў

У Беларусі шмат месцаў, якія нагадваюць пра Халакост, і не абавязкова гэта вялікія помнікі. Такіх болевых пунктаў на нашай зямлі тысячы, і часта яны знаходзяцца ў глухіх месцах, у лесе. Часам жыхары маленькіх вёсачак просяць захаваць памяць пра трагедыі, што адбываліся ў іх мясцовасці, — хоць проста разраўняць зямлю і пакласці валун там, дзе фашысты забівалі яўрэйскія сем'і. Дзякуючы мясцовым ініцыятывам мы сёння маем неверагодную карту Халакосту на Беларусі — гэта каля 500 помнікаў! Сярод іх ёсць аб'екты, вартыя высокай мастацкай ацэнкі, якія вядомыя далёка за межамі краіны.

У Еўропе тэма Халакосту шырока абмяркоўвалася яшчэ ў 60—70-я гады, а на постсавецкай прасторы ўзнімаць яе не было прынята. Таму ў нас і сёння вырашаюцца пытанні, як падаваць гэтую



памяць, дзе ставіць помнікі, як аднаўляць імёны ахвяр.

Да таго ж з'явіліся новыя сродкі прадстаўлення гэтых ведаў. Напрыклад, цяпер на Беларусі праграмісты і гісторыкі ствараюць мабільны сэрвіс, які будзе дапамагаць знайсці помнікі Халакосту, нават тыя, што ставіліся ў недасяжных, малавядомых месцах. У планах распрацоўшчыкаў — пазначыць каардынаты кожнага памятнага каменьчыка, каб падарожнікі лёгка маглі адшукаць гістарычныя аб'екты, звязаныя не толькі са знішчэннем яўрэяў, але і з іх гісторыяй. Будуць пазначацца месцы, дзе знаходзіліся сінагогі, яўрэйскія навучальныя ўстановы.

Брэсцкі тэатр «Крылы халопа» стварыў дакументальны аўдыёспектакль, прысвечаны мясцовай трагедыі. Дзякуючы мабільнай праграме можна слухаць спектакль і перамяшчацца па карце горада ў мясціны, звязаныя з вынішчэннем яўрэйскай абшчыны ў Брэсце. Неабыякавая моладзь працягвае шукаць новыя формы падачы — напрыклад, сучаснікі могуць звярнуцца з пытаннямі да ахвяр-галаграм.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

МВФ атрымаў запыты на экстраннае фінансаванне ад 103 краін

Міжнародны валютны фонд (МВФ) атрымаў запыты на выдачу экстраннай фінансавай дапамогі ад 103 краін. Выканаўчы савет фонду разгледзіць каля паловы гэтых запытаў да канца бягучага месяца, паведаміла дырэктар-распарадчык МВФ Крысталіна Георгіева. Сёлета 170 краін сутыкнуцца са зніжэннем даходаў на душу насельніцтва, адзначае Георгіева ў блогу на сайце МВФ. На мінулым тыдні фонд апублікаваў агляд сусветнай эканомікі (World Economic Outlook: The Great Lockdown), паводле якога сусветная эканоміка ў 2020 годзе зазнае спад на тры працэнты. Па словах Георгіевай, урады краін па ўсім свеце прынялі беспрэцэдэнтныя меры для барацьбы з пандэміяй каранавіруса. Бюджэтныя траты на гэтыя меры ў цэлым зараз складаюць каля васьмі трыльёнаў долараў, пры гэтым цэнтрабанкі пайшлі на маштабныя, а ў некаторых выпадках неабмежаваныя ўліванні ліквіднасці.

У ЗША другі тыдзень працягваюцца акцыі пратэсту супраць каранціну

Выступленні супраць каранцінных мер і рэжыму самаізаляцыі з-за распаўсюджвання каранавіруса прайшлі або запланаваны больш чым у дзесяці штатах, у тым ліку ў Арызоне, Агая, Паўночнай Караліне, Індзіяне, Пенсільваніі і іншых. Большасць удзельнікаў мітынгаў — прыхільнікі прэзідэнта Дональда Трампа. Пратэстоўцы заклікаюць як мага хутчэй перазапусціць эканоміку. Як паведамляе Бі-бі-сі, многія з удзельнікаў акцый пратэсту ігнаравалі правілы сацыяльнага дыстанцыявання, а таксама заклікі арганізатараў надзець маскі. Іншыя ж заставаліся ў машынах і ездзілі калонамі, перакрываючы рух. «Людзі лічаць, што дэмакраты спрабуюць падарваць эканоміку, каб выкарыстаць гэта супраць прэзідэнта», — прыводзіць Reuters словы аднаго з удзельнікаў пратэсту, рыэлтара з заходняга Мічыгана.

У Ізраілі з'явіўся ўрад. І два прэм'ер-міністры



У рэзідэнцыі прэм'ер-міністра Ізраіля адбылася нарэшце гістарычная падзея. Лідар блока «Кахоль-Лаван» Бені Ганц і кіраўнік партыі «Лікуд» Біньямін Нетаньяху падпісалі пагадненне аб фарміраванні ўрада. Пра гэта паведаміла дзяржаўнае ізраільскае радыё Kan. Левыя і правыя ўсё ж такі дамовіліся завяршыць зацяжны палітычны крызіс, яшчэ больш небяспечны ва ўмовах пандэміі. Новы кабінет характарызуюць як урад нацыянальнага адзінства. Пагадненне стварае вельмі незвычайную для Ізраіля канструкцыю ўлады. У краіне з'яўляюцца ў літаральным сэнсе слова два прэм'ер-міністры, заўважыў expert.ru. Наступныя паўтара года на гэтай пасадзе застанецца Нетаньяху. Восенню 2021-га яго зменіць Ганц і прабудзе кіраўніком урада таксама паўтара года. А далей — новыя парламенцкія выбары.

КАРОТКА

- **Пятая частка ўведзенага ў I квартале жылля ў Мінску пабудавана для тых, хто мае патрэбу.**
- Донарамі плазмы сталі 15 чалавек, якія перахварэлі на COVID-19.
- **Трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання падоўжаны да 24 мая.**
- Рэгістрацыйны аддзел ДАІ на сталічным аўтарынку «Малінаўка» адновіць работу з 22 красавіка.
- **Беларускія мытнікі ў красавіку ўжо аформілі 77 тысяч тон тавараў першай неабходнасці.**
- Нацыянальны цэнтр сучаснага мастацтва ўзначаліў топ-5 музеяў і цэнтраў сучаснага мастацтва краін СНД.
- **Навучальныя праграмы і дапаможнікі па гісторыі плануецца абнавіць.**
- Мінпрыроды распрацоўвае канцэпцыю добраўпарадкавання крыніц.
- **МУС папярэджвае пра актывізацыю кібермахляроў на фоне каранавіруса.**
- Упершыню за 70 гадоў адмянілі мюнхенскі «Актоберфэст».

Камунальныя стасункі

АЛЬТЭРНАТЫВА ПА ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ЦАНЕ

У Мінску з'явілася першая мабільная кантэйнерная пляцоўка

Магчыма, камусьці вельмі хацелася б заварыць смеццеправод у сваім доме, але пазбавіцца ад крыніцы непрыемнага паху і лішняга смецця ў пад'ездзе не заўсёды так проста, як можа здавацца на першы погляд. Зрабіць гэта можна толькі ў тым выпадку, калі вам прапануюць будаўніцтва кантэйнернай пляцоўкі. Аднак і тут можа чакаць сюрпрыз — далёка не ўсюды гарадская забудова і падземныя камунікацыі дазваляюць гэта зрабіць. Дакладней сказаць, не дазвалялі, бо спецыялісты РУП «Інстытут «Белжылпраект» знайшлі альтэрнатыву.

Каб пабудаваць звычайную кантэйнерную пляцоўку, неабходна выконваць пэўныя нарматыўныя патрабаванні. Напрыклад, збор смецця павінен быць арганізаваны не бліжэй чым за 15 метраў ад вокнаў жылога дома ці за 20 метраў ад дзіцячых пляцовак для гульні і навучальных устаноў. Пры гэтым да ўваходу ў жылы дом павінна быць не болей за сто метраў, і каб да месца збору адходаў без вялікіх намаганняў змог праехаць смецця-воз. З-за шчыльнай гарадской забудовы падобныя нормы не заўсёды магчыма вытрымаць, і смецццеправод застаецца адзіным варыянтам для збору смецця, не даючы жыхарам магчымасці адбіраць другасныя матэрыяльныя рэсурсы.

Больш за тое, будаўніцтва пляцоўкі — гэта вялікія затраты для камунальнікаў (і, як вынік, для спажыўцоў паслуг) і пэўныя нязручнасці для жыхароў дамоў. Бо трэба выканаць пэўныя земляныя работы, зрабіць падушку з бетону, устанавіць бардзюры — усё гэта займае час. І трэба ж улічваць, што ў горадзе знаходзіцца шмат падземных інжынерных камунікацый, якія рана ці позна спатрэбіцца рамантаваць. Таксама вельмі важна не зачапіць іх, калі будуць весціся раскопкі падчас будаўніцтва пляцоўкі.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

«МЫ ПАВІННЫ ВЫКАНАЦЬ ПЛАНЫ, ЯКІЯ ПЕРАД НАМІ СТАЯЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Нам вельмі моцна падставіць плячо Еўропа, асабліва міжнародныя банкі і фонды, — менавіта пад ахову здароўя. Я хачу, каб мы, карыстаючыся момантам, убачылі слабыя месцы ў нашай ахове здароўя і падцягнулі яе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы даручыў, каб усе грошы, якія краіна атрымае ад МВФ, Сусветнага банка, Банка рэканструкцыі і развіцця, пайшлі выключна на гэтую галіну.

«І самае галоўнае: мы павінны там, дзе ёсць слабае звяно інфекцыйных бальніц, падцягнуць іх», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Калі ў краіне пачаўся рост пнеўманій і выпадкаў каранавіруса, ён даручыў падключыць старшынь аблвыканкамаў і стварыць штабы, у якія кожную раніцу дакладваюць актуальную інфармацыю.

Урачы павінны толькі лячыць і выратоўваць людзей — чарговы раз нагадаў Прэзідэнт. Задача для ўсёй вертыкалі ўлады — ім зараз дапамагчы. І па яго словах, сёння кіраўнікі з гэтым спраўляюцца.

«Чаго мы чакаем? Хай прадаюць, гэта тавар», — паставіў задачу лідар дзяржавы, заўважыўшы, што неабходна праяўляць гнуткасць у вытворчасці. А гэта значыць — не толькі перапрафілявацца пад патрэбы краіны, але і не забываць пра традыцыйную прадукцыю, каб і яе пасля не давялося купляць за мяжой.

Ствараюць айчынныя лягпрамаўцы і ахоўныя касцюмы, халаты, бахілы — тое, што заказвае Міністэрства аховы здароўя.

Традыцыю насіць маскі ў перыяд ВРВІ, на думку Прэзідэнта, трэба захаваць і надалей: «У ахове здароўя жалезна будзем патрабаваць і настойваць: ***урачы заўсёды павінны быць у пальчатках і масках у звычайны перыяд».***

Яшчэ адна звычка, якая павінна захавацца і пасля пандэміі, — апрацоўка спецыяльнымі дэзынфіцыруючымі растворамі вуліц, дамоў, грамадскага транспарту. «Не кожны дзень, але хоць адзін-два разы на тыдзень мы павінны вуліцы апрацоўваць. ***Гэта наш вопыт, і мы яго павінны захоўваць»***, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы пайшлі іншым шляхам»

Пачаў размову з калектывам прадпрыемства Прэзідэнт з абмеркавання праблемы, якую вырашылі за некалькі гадоў, — забеспячэння краіны кваліфікаванымі швачкамі.

Ён падзякаваў за тое, што арганізацыя падтрымала кіраўніка ў імкненні не ўводзіць каранцінныя мерапрыемствы, а пакінуць працаваць заводы і фабрыкі. «Медыкі рэкамендавалі, але мы пайшлі іншым шляхам. Я лічыў, што жыццё ваша не трэба змяняць, — канкрэтызаваў кіраўнік краіны. — ***Я лічыў, што нельга няволіць людзей. І я бачу вынік.*** Па ўсім свеце — дэманстрацыі, пратэсты, пачынаючы ад Амерыкі, заканчваючы Паўднёвай Карэяй. Людзі выходзяць, абураюцца тым, што іх закрылі ў кватэрах».

Прэзідэнт расказаў, што больш за ўсё ён баяўся, каб жыхары не пачалі скупляць прадукты. Беларусаў ён назваў разумнымі людзьмі — зразумелі, што лішкаў не трэба. А вось у дачыненні да масак, касцюмаў для ўрачоў дэфіцыт быў. Таму задача стаяла адна — назапасіць свой рынак гэтай прадукцыяй.

«А сёння іншая праблема: куды яе дзяваць? Зноў урад хутка не сарыентаваўся — не трэба трымаць. Калі нам не трэба, мы насыцілі рынак, у нас ёсць у запасе мільёны, на складах ляжыць тавар — прападзе, — расказаў Прэзідэнт, дадаўшы і пра наяўнасць попыту ў свеце на такую прадукцыю: — Чаму не прадаць? Ёсць просьбы і ад расіян, і ад латышоў — усе вакол просяць: «Дайце». І ўкраінцы, ведаю, звярталіся. Трэба дапамагчы. ***Нам дапамагалі, і мы павінны дапамагчы»***.

«Я ж Прэзідэнт — я за гэта адказваю»

Яшчэ перад размовай Аляксандру Лукашэнку арганізавалі невялікую экскурсію па «Славянцы» — ён наведаў цэх па вытворчасці масак і бытавых павязак. Размаўляючы са швачкамі, Аляксандр Лукашэнка сам цікавіўся, як яны ставяцца да таго, што дзеці пайшлі ў школы. Таму такое пытанне і з вуснаў працоўных не стала нечаканым. Асноўны пасыл лідара на гэту тэму прагучаў наступным чынам: «Дайце дзецям магчымасць працаваць, жыць і вучыцца так, як гэта было да канікул».

Фота БелТА.

Па яго словах, гэтым часам ён назірае і за рэакцыяй бацькоў. «Людзі розныя, і я іх за гэта не асуджаю», — заўважыў Прэзідэнт. Некаторыя, што адносяць сябе да апазіцыі, крытыкуюць гэтае рашэнне. «Вось Лукашэнка пераклаў адказнасць на бацькоў» — дзікасць поўная. ***Я нават залішне бяру на сябе адказнасць і на сябе гэты груз усклаў,*** хоць многія кажуць: прэзідэнцкія выбары, не трэба напарадзе каня бегчы і напарадзе калёс. Як не трэба? Я ж Прэзідэнт — я за гэта адказваю. Усклаў адказнасць, не ўсклаў — усё роўна з мяне спытаюць», — падзяліўся ён.

Прэзідэнт адзначыў, што ніхто не будзе настойваць на тым, каб бацькі адпраўлялі дзяцей на вучобу. Пачынаць школьныя заняткі ён рэкамендуе паступова, паціху ўцягвацца ў працэс. Па словах кіраўніка краіны, да студэнтаў падыход іншы — яны дарослыя людзі, самі ведаюць свае магчымасці і імкненні.

Адна з супрацоўніц звярнула ўвагу на тое, што ў новым мікрараёне Бабруйска не хапае школы. Яе сыну даводзіцца на шляху да ведаў пераадольваць некалькі прыпынкаў на грамадскім транспарце. Па адказ на гэта пытанне Прэзідэнт звярнуўся да старшыні гарвыканкама Аляксандра Студнева. Той далажыў, што школа не будзе лішняй.

Але тут Аляксандр Лукашэнка таксама падняў праблему — што будзе са школамі ў раёнах, якія больш не развіваюцца? У сталіцы і іншыя гарадах атрымалася так: установы адукацыі ў цэнтры напалову загружаныя, а ў новых населеных пунктах даводзіцца іх будаваць. Для вырашэння пытання нельга адмаўляцца і ад ідэі пусціць школьныя аўтобусы, як у вёсках.

«У нас прыхільнікаў, нават спачуваючых, няма»

Цікавіліся людзі ў Прэзідэнта, якім крыніцам давяраць у такім масіўным патоку інфармацыі пра пандэмію.

«Вы верце таму, я яшчэ раз паўтараю, з каго спытаць можна», — параіў ён, адзначыўшы, што ў сённяшнім свеце інфармацыю не ўтоіш.

Самае балючае пытанне для лідара краіны падчас пандэміі — што будзе з намі пасля гэтага? Калі б айчынныя прадпрыемствы спыніліся, іх месца занялі б іншыя, з больш багатых краін.

«Нішы адкрыліся ў Еўрасаюзе. ***Я на гэта разлічваў, таму што гэты псіхоз скончыцца, а жыць людзям неабходна будзе яшчэ доўга»***, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы не ўяўляеце, што такое ісці аднаму супраць усяго свету, супраць плыні. Я папярэджваў сваіх, органы ўлады, дзяржаўных служачых, што ў нас прыхільнікаў, нават спачуваючых, няма», — канстатаваў беларускі лідар.

Асаблівая ўвага ў гэты час удзяляецца і дамам састарэлых, якіх у нас больш за 100. Іх дзейнасць і стан здароўя насельнікаў цяпер кантралююць дэпутаты парламента.

Прэзідэнт адзначыў, што вельмі жадае, каб наступныя два-тры тыдні прайшлі па сітуацыі з захворваннямі так, як сёння і ўчора.

Прагучала пытанне да Аляксандра Лукашэнкі і ад журналістаў. Яно датычылася рабочага графіка лідара краіны на бягучым тыдні (нядзіўна, бо і работа пула наўпрост залежыць ад гэтага), а менавіта — ці не збіраецца Прэзідэнт пачакаць з правядзенням рэспубліканскага суботніка, запланаванага на 25 красавіка.

«Калі я прымаў гэта рашэнне, я быў адназначна за суботнік. Той, хто працуе, — яны адпрацуюць. ***Мы, чыноўнікі, свае заробкі таксама пералічым у фонд гэтага суботніка.*** Святая справа», — паведаміў лідар дзяржавы.

Грошы з мерапрыемства традыцыйна будуць пералічаны на аднаўленне дзіцячых лагераў, санаторыяў, добраўпарадкаванне помнікаў да 75-годдзя Перамогі. На медыцыну грошы пералічвацца не будуць, бо, па словах Прэзідэнта, хопіць сродкаў і з іншых крыніц.

Кіраўнік краіны падкрэсліў, што да суботніка прыцягне і журналістаў, і сам паўдзельнічае ў ім. Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што традыцыйна ў гадавіну аварыі на Чарнобыльскай АЭС прыязджае ў пацярпелыя раёны Беларусі. Так будзе і сёлета.

Развітваючыся з Прэзідэнтам, кіраўнік «Славянкі» Тэймураз Бачарышвілі падарыў фотаздымак, зроблены з кіраўніком краіны падчас яго візіту на фабрыку 20 гадоў таму. Дырэктар запрасіў Аляксандра Лукашэнку зноў у Бабруйск праз 10 гадоў — на векавы юбілей прадпрыемства.

«Нават калі на пенсіі буду, прыеду», — паабяцаў лідар краіны.

Марыя ДАДАЛКА.

Медыкі чакаюць тых, хто перахварэў на COVID-19 і хоча стаць донарам

Першыя 15 чалавек, якія перахварэлі на COVID-19, ужо сталі донарамі плазмы. Нагадаем, што медыкі ўкараняюць такую методыку дапамогі пацыентам з цяжкімі формамі каранавіруснай інфекцыі — ім пераліваецца плазма ад донараў, што паправіліся. А антыцелы, якія яна ўтрымлівае, дапамагаюць арганізму справіцца з хваробай.

Першыя шэсць беларусаў здалі сваю плазму ў Мінску, учора тое самае зрабілі ў Віцебску: на абласной станцыі пераліванне крыві спецыялісты правялі забор плазмы з антыцеламі да COVID-19.

Забор імуннай плазмы будзе праводзіцца і ў цэнтры трасфузіялогіі Мінска на базе 6-й гарадской клінічнай бальніцы. Таксама ў найбліжэйшыя дні гэтую працэдуру плануюць пачаць і ўсе абласныя цэнтры. Міністэрства аховы здароўя звяртаецца да ўсіх тых, хто паправіўся, з заклікам стаць донарамі і дапамагчы ўрачам выратаваць тых, хто цяжка пераносіць захворванне.

Донарам плазмы можа стаць той, хто перахварэў на каранавірус. Пры гэтым чалавек павінен быць здаровы: цягам мінімум 15 сутак у яго не павінна быць клінічных сімптомаў і ніякіх лабараторных прыкмет каранавіруснай інфекцыі. Акрамя таго, ёсць стандартныя патрабаванні для донараў крыві і яе кампанентаў. Гэта, напрыклад, узрост 18—60 гадоў, вага не менш за 50 кілаграмаў. На працэдуру па заборы плазмы патрэбна ўсяго 30 хвілін.

Кантакты для тых, хто перахварэў на COVID-19 і хоча стаць донарам плазмы:

РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій — намеснік дырэктара Ларыса Міхайлаўна Гушчына: +375 17 298 86 56; +375 29 770 57 53.

Адзіны донарскі цэнтр: +375 29 362 82 93; +375 17 289 84 84; +375 17 289 86 43; +375 17 289 01 08.

Гарадскі цэнтр трансфузіялогіі (6-я гарадская клінічная бальніца): +375 17 239 59 13; +375 29 190 97 48.

Віцебск: 8 021 224 03 80; **Гомель:** 8 023 253 98 32; 8 023 253 98 14; **Брэст:** 8 016 228 53 81; **Магілёў:** 8 022 225 74 22; **Гродна:** 8 015 231 54 04; **Маладзечна:** 8 017 675 47 35.

Алена КРАВЕЦ.

Статусбанк

ОАО «Статусбанк»
www.stbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2020	01.01.2020
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	14 748	11 361
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	9 892	62 262
5	Средства в банках	1104	32 929	3 787
6	Ценные бумаги	1105	2 675	9 567
7	Кредиты клиентам	1106	63 731	68 598
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	3 297	3 087
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	-	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	46	57
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	-
14	Прочие активы	1113	891	1 338
15	ИТОГО активы	11	128 209	160 057
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	13	18
19	Средства клиентов	1203	60 926	90 727
20	Ценные бумаги банка	1204	1 304	3 854
21	Производные финансовые обязательства	1205	192	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	1 331	1 470
24	ВСЕГО обязательства	120	63 766	96 069
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	43 000	43 000
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	13 785	11 618
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	69	82
30	Накопленная прибыль	1215	7 589	9 288
31	ВСЕГО собственный капитал	121	64 443	63 988
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	128 209	160 057

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2020	01.04.2019
1	Процентные доходы	2011	3 684	3 381
2	Процентные расходы	2012	1 080	623
3	Чистые процентные доходы	201	2 604	2 758
4	Комиссионные доходы	2021	1 314	890
5	Комиссионные расходы	2022	322	178
6	Чистые комиссионные доходы	202	992	712
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	2	(1)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	2 191	850
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(284)	68
11	Чистые отчисления в резервы	207	600	116
12	Прочие доходы	208	320	328
13	Операционные расходы	209	4 380	4 038
14	Прочие расходы	210	226	129
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	619	432
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	164	70
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	455	362

И.о. Председателя Правления В.А. Юркова

Главный бухгалтер С.С. Ящук

Дата подписания: 6 апреля 2020 г.

УНП 807000043

ЗАО «Белреализация» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «Бикор»** (УНП 800015258) в лице управляющего по делу о банкротстве ИП Ивлева А.Ю., тел. +37544 558-88-00.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **07 мая 2020 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

№ п/п	Наименование	Начальная цена, бел. руб. без НДС
1	Автомобиль TOYOTA AVENSIS. 2006 г. в., рег. № 9933 АС-3, легковой седан, бензиновый 2.0 л., АКПП	9 360,00
2	Автомобиль GAZ-2705, 2005 г. в., рег. № АА 1999-3, грузопассажирский фургон	630,00
3	Автомобиль GAZ-2705, 2006 г. в., рег. № АА 5548-3, грузопассажирский фургон	2 070,00
4	Автомобиль CITROEN BERLINGO, 2006 г. в., рег. № 2931 ЕА-3, легковой универсал, дизельный 1,6 л.	3 330,00
5	Полуприцеп бортовой КЕГЕЛЬ SN24. 1993 г. в., рег. 1395 В-3	4 680,00
6	Станок для гибки арматуры SB40B, инв. № 0001287	1 440,00
7	Сварочный полуавтомат TRANSPULSSENERGI 40000, инв. № 00000123	4 320,00
8	Леса строительные RUBO, инв. № 0000685	10 800,00
9	Леса строительные RUBO, инв. № 0000686	10 800,00
10	Леса строительные RUBO, инв. № 0000687	10 800,00
11	Контейнер стальной 4*2*1,8, инв. № 0000228	1 170,00
12	Автомобиль грузовой седельный тягач МАЗ 6422 г. н. АК 7100-3	20 700,00
13	Полуприцеп специальный самосвал МАЗ 9506 00(020) г. н. А 1056 В-3, 2008 г. в.	8 460,00

Местонахождение – г. Гомель, ул. Молодости, 6, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-03.

Для участия в торгах необходимо в срок с 22.04.2020 г. 09.00 по 06.05.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися, предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано на сайте bankrot.gov.by

УП «Белконфискат»
объявляет о проведении электронных торгов 14.05.2020 г. по продаже имущества, изъятого у Яблонского Д.А.
Легковой седан «Мерседес-Бенц Е280», 2001 г. в.,
начальной стоимостью 2 800 рублей.
На сайте **belkonfiskat.by** размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них.
Справки по тел.: 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809.
УНН 190431606

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «СМТ №8», г. Минск, ул. Пионерская, 37**
Предмет аукциона Месторасположение: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 91А и 91Д**	
Производственная база в составе: **склад РМХ-20** (350/С-174808, 193,5 кв. м), **здание материального склада № 2** (350/С-56797, 478,6 кв. м), **здание административно-бытовое** (350/С-56799, 550,5 кв. м), **гараж** (350/С-56788, 675 кв. м), **склад по обогреву инертных материалов** (350/С-56798, 29,6 кв. м), **склад масел** (350/С-56822, 23,5 кв. м), **здание материального склада № 1** (350/С-56796, 1072,5 кв. м), **склад цемента** (350/С-56819, 33 кв. м), **проходная** (350/С-56823, 14,8 кв. м), **компрессорная** (350/С-56820, 62,6 кв. м), **котельная** (350/С-56800, 110 кв. м), **ограждение и бетонная площадка производст-венной базы** (350/С-204615, составные части: ограждения – ж/б – 468,1 кв. м, 316.0 кв. м, 1214,5 кв. м, из металлической сетки – 11,5 кв. м, деревянное – 17,1 кв. м, металлическое – 4.8 кв. м, кирпичное – 4,3 кв. м; ворота, калитка, площадка бетон., покрытия). ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен на праве постоянного пользования пл. **4,4874** га для эксплуатации и обслуживания администрат. и производственно-склад. помещений производ. базы и пл. **0,5576** га для эксплуатации и обслуживания зданий специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ. Обременения прав на зем. уч. 0,5576 га – охранные зоны линий связи и радиофикации, электрич. сетей, сетей и сооружений водоснабжения и канализации	
Обременения: площади здания материального склада № 2, бетонная площадка, склад масел, часть помещений гаража и здания материального склада № 1 сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 50 822,38 бел. руб. (снижена на 78 %)	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона) перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки».	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорены в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by	
Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.04.2020	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Дата и время проведения аукциона: 06.05.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.05.2020 до 17.00** по указанному адресу	

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**		
Продавец	**ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4**		
Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес
Предмет аукциона, который состоится 26.05.2020			
Лот № 1			
Здание заводоуправления	2 935,2 кв. м	730/С-12820	**Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1А**
В состав лота входят следующие сооружения: **подъездная дорога** (1234 кв. м, инв. № 730/С-17065); **ограждение** (240 кв. м, инв. № 730/С-17063); **ограждение** (148 кв. м, инв. № 730/С-17062); **участок канализации** (97,8 м, инв. № 730/С-17060); **ввод водопровода** (9,7 м, инв. № 730/С-17061)			
***Сведения о земельном участке*:** пл. **1,0277 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.08.2065) для обслуживания здания заводоуправления			
Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 757 398,89 бел. руб.			
Лот № 2			
Незавершенное законсервированное капитальное строение (здание административно-хозяйственное)	7 458 кв. м	730/U-15754	**Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1/1**
Сведения о земельных участках: пл. **0,3478 га**, **0,0005** и **0,0005 га** предоставлены продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения			
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 3 378 885,70 бел. руб.			
Лот № 3			
Столовая	2098,2 кв. м	710/С-57661	**Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гагарина, 12**
Составные части и принадлежности: подвал, два крытых крыльца, два крыльца, ворота, асфальтное покрытие, забор			
Склад	125 кв. м	710/С-60480	
Склад кирпичный (к столовой № 9)	97,8 кв. м	710/С-76250	
Составные части и принадлежности: ворота, забор			
Ограждение площадки для мусора	-	710/С-57176	
Тепловая сеть к столовой № 9	20,2	710/С-79760	
В состав лота входит сооружение, оборудование и товарно-материальные ценности – перечень на сайте организатора аукциона (cpo.by)			
***Сведения о земельном участке*:** пл. **0,6237 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений по хранению и переработке продуктов питания			
Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 598 067,82 бел. руб.			
Дата и время проведения аукциона по лотам № 1–3	**26.05.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**		
Дата и время окончания приема документов по лотам № 1–3	**по 22.05.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**		
Предмет аукциона, который состоится 11.05.2020			
Лот № 4			
Здание блока бытовых и вспомогательных помещений	191,6 кв. м	710/С-41980	**Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гагарина, 12**
Склад	50,8 кв. м	710/С-75687	
Ворота	-	-	
***Сведения о земельном участке*:** пл. **0,0814** га предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий: блока бытовых и вспомогательных помещений и склада. Ограничения (обременения) прав: зона санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения и в местах водозабора			
Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 21 754,34 бел. руб.			
Лот № 5			
Торговый павильон, металл. 10*4*3 м. (с охранной сигнализацией) 2011 г. в.	40 кв. м	13001000005; 09040000082	**г. Бобруйск, Минское шоссе (автостоянка возле проходной СКГШ)**
Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 11 596,81 бел. руб.			
Лот № 6			
Незавершенное законсервированное капитальное строение (здание одноквартирного жилого дома)	209 кв. м	730/U-16808	**Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Мельникова, 5**
Сведения о земельном участке: пл. **0,2203 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания ведомственного жилого дома. Ограничения (обременения): охранные зоны линий электропередачи до 1000 вольт, систем газоснабжения (пл. 0,0505 га)			
Начальная цена лота № 6 без НДС – 13 418,17 бел. руб. (снижена на 60 %)			
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY60-BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390			
Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона		
Условия оплаты предмета аукциона			
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи			
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**			
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия			
Предыдущее извещение о проведении аукциона по лотам № 4–6 опубликовано в газете «Звязда» 12.02.2020			
Дата и время проведения аукциона по лотам № 4-6	**11.05.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**		
Дата и время окончания приема документов по лотам № 4-6	**по 08.05.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**		

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

УП «Белконфискат»
обьявляет о проведении электронных торгов 15.05.2020 г. по продаже имущества, изъятого у Хвоенок Д.Н.
Легковой седан «Ауди 80», 1989 г. в.,
начальной стоимостью 900 рублей.
На сайте belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них.
Справки по тел.: 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809. УНН 190431606

ЯК НЕ ПЕРАСТУПІЦЬ РЫСУ НЯНАВІСЦІ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адна з асаблівасцяў Беларусі ў тым, што над тэмай Халакосту працуюць не толькі мясцовыя яўрэйскія абшчыны. Сведкаў жахлівых падзей (ці іх нашчадкаў) раскідала па ўсім свеце. І нават праз 75 гадоў пасля заканчэння вайны людзі захоўваюць каштоўныя звесткі — аповеды пра месцы, дзе адбываліся расправы, імёны ахвяр, падзеі. Многія помнікі, якія адкрываюцца і будуць адкрывацца ў нашай краіне, — гэта прыклад міжнароднага супрацоўніцтва ў вяртанні і захаванні памяці. Мемарыяльны комплекс «Трасцянец» — найбольш яскравы таму прыклад.

«Гэтае перапляценне лакальнай памяці з міжнароднай, на мой погляд, вельмі важна, — упэўнена **старшыня ГА «Рэспубліканскі фонд «Халакост» Галіна ЛЕВІНА.** — Многія да канца не ўсведамляюць маштабы трагедыі на нашай зямлі — што ў Беларусі больш за 800 тысяч людзей знішчылі толькі за тое, што яны яўрэі. Вялікае значэнне мае адукацыя. Ад таго, як сёння вядзецца работа са школьнікамі, моладдзю, залежыць будучыня. Калі страціць пераемнасць, мы не зможам далей усталёўваць новыя знакі, ствараць фільмы, расказваць пра трагедыю яўрэяў у Беларусі».

Зварот да моладзі

Памяць аб Халакосце — шлях да талерантнасці і паразумення ў сучасным свеце. І таму яна такая важная ў выхаванні маладога пакалення. Дзеці знаёмяцца з ёй на ўроках гісторыі, больш паглыблена могуць вывучаць на факультатыўных занятках, у аб'яднаннях па інтарэсах ваенна-патрыятычнага кірунку, што дзейнічаюць на базе ўстаноў дадатковай адукацыі. У 2019—2020 гадах ва ўстановах усёй краіны праводзяцца рэспубліканскія акцыі «Беларусь памятае» і «Вялікай Перамозе 75». Дзеці вывучаюць гісторыю сваіх мясцін, біяграфіі ўдзельнікаў, сведак і ахвяр вайны.

Падчас конкурсу «Зорачка на карце раёна» хлопчыкі і дзяўчынкі вывучалі помнікі ваенных падзей, у тым ліку і звязаныя з Халакостам. Навучэнцамі створана больш за 120 інтэрактыўных картаў на тэрыторыі сельсаветаў, раёнаў і абласцей, дзе прадстаўлена апісанне больш чым 2500 помнікаў ваеннай гісторыі. Карты выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе, а таксама пры стварэнні экскурсій ваенна-патрыятычнага кірунку.

У рамках рэспубліканскага конкурсу «Пазнаём Беларусь разам» навучэнцамі ўстаноў адукацыі распрацавана каля 450 турысцка-экскурсійных маршрутаў, у тым ліку 60 па месцах, звязаных з ваенным перыядам. Напрыклад, навучэнцы Чэрыкаўскага раёна стварылі экскурсійны маршрут да месца расстрэлу яўрэйскага насельніцтва. Сталічныя школьнікі праводзяць урокі-экскурсіі на мемарыяльным комплексе «Яма». У межах праекта «Трасцянец — месца памяці, Трасцянец — месца смутку» распрацаваны экскурсіі па мемарыяле. Іх праводзяць экскурсаводы музеяў установаў адукацыі — як для навучэнцаў і педагогаў, так і для гасцей горада. Матэрыялы, якія знаёмяць з трагедыямі Мінскага гета і канцлагера «Трасцянец», можна знайсці на сайце Мінадукацыі. У Гродзенскай вобласці ствараецца інфармацыйна-адукацыйны інтэрнэт-праект «Гісторыя #Памяць #Будучае.by», які будзе ў тым ліку размяшчаць гугл-карты да месцаў памяці пра ахвяр вайны, прэзентацыі, інфармацыю, прысвечаную праведнікам.

Для маладога пакалення важна не толькі чуць слова «Халакост»: задача сучаснікаў — напаўняць яго сэнсам, паказваць, што гэта такое. Новым пакаленням гэтая тэма становіцца больш зразумелая, калі яны чуюць пра яе не як пра трагедыю шасці мільёнаў забітых, а адкрываюць асобныя гісторыі, лёсы канкрэтных людзей.

«Я хацела жыць»

«З першага дня мой бацька быў адным з кіраўнікоў супраціўлення Мінскага гета. Мой старэйшы брат падарваў 17 эшалонаў (я магу гэта пацвердзіць архіўнымі дакументамі). Сярэдні брат ляжыць у Трасцянцы, яму было ўсяго 16 гадоў. У 1942 годзе зімой да нас (тады гэта была Рэспубліканская вуліца) наляцела гестапа, шукалі зброю. Дзеці былі як старыя, яны разумелі небяспеку. І калі маці крыкнула, што трэба ратавацца, я выскачыла ў калідор, пасля ў двор і схавалася ў прыбіральні. Калі сцямнела, вечарам мяне дасталі — я гэты момант не помню, — у мяне былі адмарожаныя рукі і ногі. Мне быў сёмы год, — узгадвае старшыня Мінскага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Гілф», былая вязніца Мінскага гета Фрыда Рэйзман. — Ці паверыць мне, калі я скажу, што бачыла раку крыві, што цякла па вуліцы пасля пагрому? Я бачыла дзіцячы дом, у юдэнраце дзяцей проста сабралі пад дахам, іх не кармілі, бо не было чым. Знясіленыя, малыя не маглі хадзіць, іх не забівалі кулямі, а заразалі ў ложках. Я бачыла ў чатырохдзённым пагроме, як немец бярэ за адну ножку немаўля, і — аб рог дома, і галоўка разляталася як кавун. На Юбілейнай плошчы (там да і пасля вайны быў кірмаш) расстрэльвалі 17-18-гадовых дзяўчат. Калі я разумела, што магу памерці, у мяне адключалася свядомасць. Я хацела жыць! Перадаць немагчыма, што чалавек можа зрабіць з чалавекам. Але самае страшнае — тое, што пасля вайны гэтая тэма замоўчвалася. Я аднойчы пыталася ў бацькі, што стала з яўкай, якая была на Нямізе. Тата сказаў, што нехта выдаў. Падпольшчыкі, якія там знаходзіліся, адстрэльваліся, паклалі многа фашыстаў і самі загінулі. Але чаму нідзе не пішуць, што ў цэнтры горада быў бой?»

На жаль, упушчаны час, калі можна было збіраць інфармацыю ад сведкаў, што былі дарослыя ў часы трагедыі. Але і ўспаміны дзяцей вайны і архівы — важная крыніца.

Фрыда Вульфаўна — адна з тых актывістаў, хто змагаецца за захаванне памяці пра Халакост. Многа гадоў пасля вайны яна шукала свайго збавіцеля з вёскі Узляны Пухавіцкага раёна. Мужчына шмат разоў праязджаў праз пасты і заставы ў Мінск, разам з памочнікамі на возе вывозіў людзей з гета. Гэты адважны чалавек загінуў, а яго прозвішча было невядома. Першы помнік праведнікам свету з'явіўся таксама дзякуючы намаганням Фрыды Рэйзман — у вёсцы Парэчча Пухавіцкага раёна. Па сваім маштабе гэты ўчынак беларускіх праведнікаў вылучаецца ў гісторыі Халакосту — у 1943 годзе жыхары невялікай вёсачкі прынялі ў свае сем'і каля 40 дзяцей з Мінскага гета.

Наш гонар

У канцы лістапада мінулага года гарадскі мастацкі савет разгледзеў праект помніка Праведнікам свету, над якім у апошнія гады жыцця працаваў архітэктар Леанід Левін. На сёння вядома каля 800 імён беларусаў, якія рызыкавалі сваім жыццём, ратуючы яўрэяў. Гэта гонар народа — гераічнага, адкрытага, самаахвярнага. Ініцыятыўная група, у якую ўваходзіць многа розных арганізацый, займаецца прасоўваннем гэтага праекта, шукае фінансаванне. Размяшчэнне знака плануецца ў Мінску на мемарыяле ахвярам генацыду «Яма».

Яшчэ адна важная тэма, якой у апошнія гады ўдзяляецца асаблівая ўвага, — яўрэйскае супраціўленне. Усё больш такой інфармацыі падаецца ў музеях, кнігах і помніках. Можна згадаць пра музей яўрэйскага супраціўлення ў Навагрудку. Новыя факты працягваюць адкрывацца, шмат старонак гісторыі яшчэ трэба вывучыць.

Новы буйны мемарыяльны комплекс павінен з'явіцца ў Дзяржынску. У вайну тут за чатыры гадзіны было забіта 1600 чалавек. Помнік будзе вяртаць імёны ахвяр — на сёння з іх вядомы 440. Мемарыял знішчаным яўрэям Койданава — гэта яшчэ адзін помнік — запрашэнне да дыялогу. Людзі, якія прыйдуць сюды, будуць шукаць адказы на пытанні, чаму такая трагедыя стала магчымая і як не перайсці рысу нянавісці.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Падпіска-2020

АД «ЗВЯЗДЫ» СВЕЖЫЯ НАВІНЫ, СВЕЖАЯ... ГАРБАТА

Старыя правілы: каб пераканацца, што госць пайшоў, трэба спусціць яго з лесвіцы — то-бок праводзіць... Каб паспадзявацца, што госць прыйдзе, трэба яго запрасіць. І гэта «Звязда» рабіла, прычым досыць часта — у прыватнасці, нашы падпісчыкі і дзелавыя партнёры прыходзілі на кожны розыгрыш прызоў.

Гэтым разам — на вялікі жаль і па зразумелых прычынах — пасяджэнне тыражнай камісіі адбылося без шаноўных гасцей, аднак у поўнай адпаведнасці з умовамі гульні, з захаваннем яе традыцый.

Паводле іх кожны, хто аформіў падпіску на «Звязду» на другі квартал альбо першае паўгоддзе 2020-га і даслаў у рэдакцыю картку-купон (яны друкаваліся цягам падпісной кампаніі разам з праграмай тэлерадыёперадач), мог прэтэндаваць на фірменны «звяздоўскі» тэрмас альбо грыль-барбекю. Тут, у рэдакцыі, усе дасланыя карткі рэгістраваліся, сартаваліся па абласцях і горадзе Мінску, потым па чарзе ссыпаліся ў чароўны саламяны капялюш. Днямі з яго дасталі...

Такім чынам, **тэрмас з лагатыпам газеты «Звязда»** выйгралі:

Марыя Ігнатаўна Пратасевіч, а/г Хомск Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці;

Раіса Іванаўна Сарока, в. Сітцы Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці;

Мікалай Валянцінавіч Старых, г. Гомель;

Ніна Уладзіміраўна Фурс, г. Гродна;

Надзея Савельеўна Марус, г/п Глуск Магілёўскай вобласці;

Людміла Станіславаўна Бачышча, п. Крупскі Мінскай вобласці;

Вольга Іванаўна Астроўская, г. Мінск.

Суперпрыз — грыль-барбекю Sundays Allan — выйграла Таццяна Віктараўна Маркава, в. Малая Уса Уздзенскага раёна Мінскай вобласці.

Віншуем! Тым жа, каго ўдача абмінула, нагадаем стары анекдот. Адзін дзядзька шторанак да бога звяртаўся: маўляў, дапамажы мне выйграць прыз ад газеты «Звязда»!.. Задурыў галаву сваёй просьбай. І бог-такі адазваўся, сказаў: «Дык памажы і ты мне — падпішыся на гэтае выданне, дашлі тую картку і тады...»

Высновы за вамі.

Афіцыйна:

Арганізатарам рэкламнай гульні «Смачны надвячорак са «Звяздой» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013.

Рэкламная гульня «Смачны надвячорак са «Звяздой» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 06.03.2020 г. (пасведчанне № 3758) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 14 сакавіка да 30 чэрвеня 2020 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2020 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 104 падпісчыкі. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 263 66 73.

Альтэрнатыва па дэмакратычнай цане

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак спецыялісты Інстытута «Белжылпраект» знайшлі рашэнне гэтай праблемы і распрацавалі мабільную канструкцыю на бетоннай аснове, якую можна будзе перамясціць з дапамогай спецыяльнай тэхнікі.

— Калі мы распрацоўвалі праект, то ў першую чаргу ўлічвалі некалькі аспектаў: нашы пляцоўкі павінны быць недарагія і зручныя для існуючых прыдамавых тэрыторый, і трэба, каб іх можна было хутка ўстанавіць, — кажа **дырэктар РУП «Інстытут «Белжылпраект» Дзяніс ЖЭЙМА.** — Таксама яны павінны прыгожа выглядаць і ўпісвацца ў жылую забудову. Менавіта таму мы стварылі тры розныя варыянты, каб камунальнікі маглі выбраць найлепшы для сябе.

Як тлумачыць Дзяніс Алегавіч, для ўстаноўкі такіх пляцовак не трэба праводзіць дарагіх падрыхтоўчых работ, а ўстанавіць падобную пляцоўку без вялікіх намаганняў змогуць тры спецыялісты за тры дні — ім спатрэбіцца проста сабраць канструкцыю. Пры гэтым аб'ект можна будзе размяшчаць, не хвалюючыся за падземныя інжынерныя сеткі, — у любым выпадку на працягу адной гадзіны пляцоўку можна будзе перастаўляць на новае месца з дапамогай крана.

— Па сутнасці, такія пляцоўкі — гэта малыя

архітэктурныя формы, і таму, на наш погляд, працэс узгаднення з рознымі гарадскімі службамі ўстаноўкі такіх аб'ектаў можна будзе значна спрасціць, бо цяпер гэта займае шмат часу, — лічыць Дзяніс ЖЭЙМА.

На погляд спецыялістаў, для гэтага будзе дастатковa рашэння раённай адміністрацыі з пэўнымі рэзалюцыямі ад аддзела па надзвычайных сітуацыях, санітарных службаў і фінансістаў. У такім выпадку выйграюць усе, і самае галоўнае — людзі.

Першы мабільны аб'ект устанавілі ў Заводскім раёне Мінска на вуліцы Ташкенцкай — там не знайшлося месца для будаўніцтва звычайнай пляцоўкі. Адзін блок з трох кантэйнераў прызначаны для збору цвёрдых камунальных адходаў, другі (таксама з трох бакаў) — для збору другасных матэрыяльных рэсурсаў, а трэці — для буйнагабарытных адходаў. Выкінуць адходы ў пэўны кантэйнер жыхары могуць праз спецыяльнае акенца з гумавай шторкай на дзвярах пляцоўкі (за выключэннем блока для буйнагабарытных адходаў). Дарэчы, дзверы двух блокаў (для ЦКА і ДМР) замыкаюць на ўніверсальны ключ, а на самой пляцоўцы размешчаны графік вывазу ўсіх відаў адходаў.

* * *

Праекціроўшчыкі адзначаюць, што затраты на ўстаноўку мабільнай пляцоўкі меншыя ў 5—8 разоў, і роўна настолькі скарачаецца і час, які раней траціліна будаўніцтва звычайнай пляцоўкі. І хто ведае: магчыма, зусім хутка не толькі спросцяць працэс узгадненя, але і санітарныя нормы стануць менш суровыя — відавочна ж, што новы варыянт пляцоўкі выглядае куды больш эстэтычна.

Валерыя КІСЛАЯ, фота аўтара.

На паліцу

ЧЫТАЦЬ, КАБ ПОМНІЦЬ

Каля двух дзясяткаў кніг, якія ўбачылі свет да 75-годдзя Вялікай Перамогі, прадставілі ў Мінску беларускія дзяржаўныя выдавецтвы.

У пэўным сэнсе слова флагманам у тэме Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», зазначыла **дырэктар выдавецтва Вольга ВАНІНА.** Тут у 2019-2020 гадах у шчыльным супрацоўніцтве з Нацыянальным архівам і Беларускім архівам кінафотафонадакументаў, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны выпушчаны цэлы шэраг змястоўных, афармленых па найноўшых паліграфічных тэхналогіях выданняў, а яшчэ некалькі выйдзе з тыпаграфіі ў найбліжэйшы час.

